Выпуск №159 (февраль, 2023)

# Большая перемена




Издается с декабря 2005 года

Газета Государственного учреждения образования «Средняя школа №2 г. Калинковичи»

**МОВА – ТВАЯ АДМЕТНАСЦЬ**

*Толькі праз родную мову чалавек можа стаць беларусам, бо ў ёй хімія і фізіка, гісторыя і батаніка, эканоміка і культура таго, што называецца нацыяй, народам.*

**ЯНКА СІПАКОЎ**

## В ЭТОМ ВЫПУСКЕ

«Не пакідайце ж мовы беларускай...» ................ 1-2

Развітанне з зімой ........ 2

По следам Победы ........ 3

Любовь спасёт мир ...... 3

Брестская крепость, Мирский замок и «Хатынь»: какие белорусские музеи можно посетить онлайн .............................. 4

Цытаты вядомых людзей ........... 4

# «НЕ ПАКІДАЙЦЕ Ж МОВЫ НАШАЙ БЕЛАРУСКАЙ...»

***24 год запар мы адзначаем Сусветны дзень роднай мовы. Балюча ўсведамляць, што мы гаворым пра родную мову адзін раз на год. І то пра мову, а не на мове. А чаму не гаворым на ёй кожны дзень? Што нам перашкаджае?***

Нікога даўно не здзіўляе той факт, што мы, беларусы, амаль не гаворым на сваёй мове. Яе, як рарытэт, паклалі на паліцы разам са слуцкімі паясамі і дастаём толькі на вялікія святы.

А што такое мова? З аднаго боку – гэта сродак зносін, з другога – прыкмета ідэнтычнасці і самабытнасці народнасці. Мова яднае нас у народ, які носіць прыгожае імя – беларусы. Для нашага народа родная мова – беларуская. Яна з'яўляецца каштоўным дыяментам сярод безлічы моў свету, якую лічаць адной з найпрыгажэйшых у свеце. Яна сучасная і развітая, на ёй лёгка выказаць свае думкі і пачуцці. І пры гэтым усім яна вельмі мілагучная...

У штодзённым жыцці большасць грамадзян гаворыць па-руску, таму што раслі ў рускамоўным асяроддзі і з маленства чулі не родную, а менавіта суседскую мову. Руская мова паўсюдна панавала і пануе сёння ў нашым грамадстве, беларуская знаходзілася і знаходзіцца дзесьці на ўзбочыне і не выкарыстоўваецца сваім жа народам.

Але пры такім становішчы беларускія словы пастунова знікнуць, і новыя пакаленні застануцца без унікальнай мовы — сакавітай, багатай, незвычайна пявучай. Адгарніце любы твор беларускага пісьменніка і ўчытайцеся ў словы. Як прыгожа апісваецца прырода Беларусі, як тонка перадаюцца адценні чалавечых пачуццяў. Толькі беларуская мова здольна размежаваць "любовь к девушке" і "любовь к сарделькам" з дапамогай розных слоў: каханне і любоў.

І я, дарослы ўжо чалавек, доўга не магла наважыцца размаўляць на роднай мове ў грамадскіх месцах: у магазіне, у транспарце, на працы. Нешта ў сярэдзіне мяне самой увесь час стрымлівала. Можа, ад празмернай увагі людзей. Але ж я здолела перамагчы сябе. І ўсё часцей і часцей кажу на роднай мове. І якая ж рэацыя людзей? У большасці сваёй усміхаюцца, некаторыя кажуць, што прыемна чуць беларускую мову. Праўда, некаторыя перапытваюць. Але гэта, я думаю, ад нечаканасці.

Таму звяртаюся да тых, хто хацеў бы размаўляць на роднай мове, але па нейкіх прычынах не робіць гэтага. Пасля таго, як вы пераадолееце ў сабе гэту няўпэўненасць, вы здзівіцеся, якую асалоду ў выніку атрымаеце, як многа знойдзеце!

*Працяг на старонцы 2.*

**ДЗЕНЬ РОДНАЙ МОВЫ**

# «НЕ ПАКІДАЙЦЕ Ж МОВЫ НАШАЙ БЕЛАРУСКАЙ…»

ПРАЦЯГ. ПАЧАТАК НА СТАРОНЦЫ 1

А тым, хто ніколі нават не задумваўся, на якой мове яму размаўляць, хачу прыгадаць словы Францішка Багушэвіча: *«Шмат было такіх народаў, што страцілі найперш мову сваю, так як той чалавек перад скананнем, катораму мову займе, а потым і зусім замёрлі. Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!»*

Кожны чалавек павінны памятаць, што валоданне беларускай мовай – гэта не «неабавязковы дадатак», гэта тое, што ў сукупнасці з нашай культурай і гісторыяй дае нам права звацца беларусамі.

Зберагчы беларускую мову і пашырыць асяродак яе ўжывання – гэта наш прамы абавязак перад самімі сабой і наступнымі пакаленнямі.

***Т.П. Макарэвіч***




*Фотаакцыя «Мова—твая адметнасць»*

**ШЫРОКАЯ МАСЛЕНІЦА**

# РАЗВІТАННЕ З ЗІМОЙ

***У апошнюю суботу лютага ў Калінкавічах па традыцыі адсвяткавалі Масленіцу. Гэта свята ў народным календары займае асобнае месца. Нашы продкі ўспрымалі яго як пачатак новага жыцця і ўшаноўвалі сонца, што абуджае ўсё жывое. Масленіца – традыцыйнае свята нашага народа, неад'емная частка яго культуры.***

Развітанне з зімой і прывітанне вясны перавандравалі з язычніцтва ў хрысціянства даўным-даўно, але атрыбутыку сваю свята да нашых дзён захавала. А з ёй і традыцыю: спаліць пудзіла, каб расстацца з халадамі і паскорыць прыход цёплых дзён. І бліны як пяклі нашы продкі ў старажытнасці, так і мы следам за імі звычай гэты з задавальненнем паўтараем. Калінкавічане гісторыю роднай Беларусі берагуць, а таму да народных свят ставяцца з душой.

Вось і 25 лютага вучні і настаўнікі нашай школы з задавальненнем паўдзельнічалі ў “Масленічнай ярмарцы”, падчас якой была наладжана вытаўка дэкаратыўна-прыкладной творчасці з удзелам скамарохаў і карабейнікаў. Жыхарам горада былі прапанаваны бліны з варэннем, з мёдам, а самае галоўнае – вясёлы настрой.

Дзякуючы гэтаму святу, вучні нашай школы паіншаму вучацца глядзець на народныя традыцыі і абрады. Прымаючы ўдзел у святах, мы ў якія ўжо раз упэўніваемся, што наша краіна вельмі багатая на культурную спадчыну.

***Аляксандра Колас***





# ПО СЛЕДАМ ПОБЕДЫ...

***11 февраля 2023 года в г. Калинковичи прошел районный этап республиканской патриотической квест-игры «По следам Победы…», приуроченный Году мира и созидания.***

В формате увлекательной и познавательной игры 11 команд Калинковичского района состязались в знаниях о событиях и фактах Великой Отечественной войны. В квест-игре приняла участие команда средней школы №2 г. Калинковичи "Наследие", в состав которой входили пионеры дружины имени Т.И. Брагонина под руководством капитана команды Веремеевой Вероники.

Перед командами стояла нелёгкая задача – за максимально короткое время пройти пять игровых станций: «Костровую», квиз «Знай наших!», «Солдатскую песню», «Великие полководцы» и «Послание», правильно и быстро выполнить все задания.





Получив маршрутные листы, участники отправились на станции. На одном из этапов им необходимо было из спичек собрать как можно больше видов костров, назвать их, на другом – сопоставить фотографии полководцев времен Великой Отечественной войны с их биографиями. Ожидало школьников и музыкальное испытание – записать названия прослушанных песен военной тематики. Как орешки щёлкали ребята вопросы квиза, а на пункте «Послание» фотографировались, выстроив команду в виде звезды, и размещали фото в социальных сетях.

По итогам квест-игры команда «Наследие» заняла II место.

Результатами игры учащиеся доказали, что настоящий гражданин знает историю своей страны, гордится её достижениями и старается прославлять её во имя мирного будущего.

***София Пырко***

ШЕСТОЙ ШКОЛЬНЫЙ ДЕНЬ

# ЛЮБОВЬ СПАСЁТ МИР

***25 февраля 2023 года в целях развития познавательного интереса к изучению языкам и расширения лингвистического кругозора был проведен поэтический конкурс «Любовь спасет мир». В конкурсе чтецов приняли участие учащиеся 5-9 классов. Ребята декламировали стихотворения белорусских и русских поэтов о природе и любви.***

В этот день звучали стихи Я. Купалы, Я. Коласа, М. Богдановича, Е. Янищиц, М. Цветаевой, А. Пушкина, А. Блока и других известных авторов.

Каждое выступление было неповторимым и выразительным.

Конкурс позволил ребятам еще раз прикоснуться к миру поэзии и узнать, что стихотворения о любви и природе звучат одинаково прекрасно на двух языках.

***Александра Колос***




*Участники конкурса чтецов*

Тираж 30 экземпляров



ГУО «Средняя школа №2
г. Калинковичи»

Адрес школы: 247710,
г. Калинковичи
Гомельской области,
ул. Пионерская, 27 Б

Телефон: 2 - 38 - 84

Email: guo.sosh2@mail.gomel.by

http://k-soch-2.schools.by

Учредители:
Администрация
ГУО «Средняя школа №2
г. Калинковичи»,
Совет Школы

Мы вместе!

## ЦЫТАТЫ ВЯДОМЫХ ЛЮДЗЕЙ

***Я – беларус, мая родная мова – беларуская.***

**Васіль Быкаў**

* * *

*Ніякае багацце людзей не бывае даражэйшым за іх родную мову.*

**Якуб Колас**

* * *

***Хто забыў сваіх продкаў – сябе губляе, хто забыў сваю мову – усё згубіў.***

**Уладзімір Караткевіч**

* * *

*Хто не паважае родную мову, не паважае родны народ.*

**Іван Мележ**

* * *

***Яно добра, а нават і трэба знаць суседскую мову, але найперш трэба знаць сваю.***

**Францішак Багушэвіч**



# БРЕСТСКАЯ КРЕПОСТЬ, МИРСКИЙ ЗАМОК И «ХАТЫНЬ»: КАКИЕ БЕЛОРУССКИЕ МУЗЕИ МОЖНО ПОСЕТИТЬ ОНЛАЙН

***Третьяковка, Лувр, Британский музей – эти знаменитые историко-культурные объекты можно посетить не выходя из дома, с помощью интернета. А знаете ли вы, что виртуальные экскурсии существуют и у белорусских музеев? Предлагаем вам подборку самых интересных онлайн-экскурсий.***



Наверняка каждому хоть раз доводилось бывать в **Брестской крепости-герое.** Но, если по какой-то причине посетить ее не удалось, сделать это можно онлайн. На сайте комплекса написано, что для виртуальной прогулки доступно несколько экспозиций: «Музей войны – территория мира», «Летопись Брестской крепости», «Оборона Восточного фронта» и «Музей обороны Брестской крепости».

**Березовский историко-краеведческий музей** предлагает посетителям ознакомиться с онлайн-экспозицией об истории картезианского монастыря, основанного в XVII веке. У гостей есть возможность не только увидеть шесть залов, но и прослушать аудиоэкскурсию от гида.

**Мемориальный комплекс «Хатынь»** доступен для дистанционного посещения всегда.

Посетив сайт **Глубокского историко-этнографического музея,** можно найти ссылку на видеотур. Герой ролика в сером костюме, старомодных очках и со старельким чемоданом прогуливается по экспозиции, демонстрирует старинные монеты, одежду предков, тем временем закадровый голос рассказывает о развитии сельского хозяйства и промышленности. Затем происходит нечто странное: манекен, который держал в руках утюг, внезапно оживает и показывает, как правильно пользоваться прибором. Потом снова замирает, как ни в чем не бывало.

Ознакомиться с одним из древнейших городов Беларуси – **Туровом** – можно на виртуальной историко-археологической экспозиции **«Древний Туров»,** созданной местным краеведческим музеем. Перейдя по ссылке на сайте, можно попасть внутрь здания.

Погулять онлайн можно и по **Мирскому замку.**



***Редколлегия***

Ответственный за выпуск Макаревич Т.П.